60-х гг. прошлого века, однако большинство выявленных в тексте топонимов можно отнести именно к этой группе, поскольку они не связаны прямо с развитием сюжета.

*В третьей группе* оказываются названия далеких объектов, не связанные с развитием сюжета и выполняющие сугубо топонимическую функцию: *1. Отец привез с Кавказа рассказы о семье, у которой они снимали угол, о чаче, которой его всегда угощал хозяин дома* [3, 148]; *2. Они сидели ... рядом с сервантом, набитым фарфоровыми сервизами, по которым плакали, наверное, обедневшие фрау где-то в Мюнхене, Дрездене или Берлине…*[3, 173]; *3. Долго обдумывал он план объехать СССР, посмотреть на привольный Байкал, на туманные Курилы, на раздольный Амур, посетить Среднюю Азию, побывать на Урале, на Севере* [5, 67].

К этой же группе можно отнести и хоронимы из следующего отрывка из повести В. Казакевича «Охота на майских жуков», употребленные писателем для «исторического экскурса» в биографию героини: *Мы с братом не догадывались, что Марьяна прибыла к нам прямиком из Древней Руси. Тысячу лет назад ее деревушка входила в западные княжества Киевской Руси. Татаро-монголы, захватившие Киев, повернули коней перед болотами и чащами этого края. И в схоронившихся за соснами хатках остался жить старинный язык сгинувшего Киевского государства. Потом эта глушь оказалась в Княжестве Литовском, слившемся с Речью Посполитой. А затем деревеньку, словно великан мошку, проглотила Российская империя* [2, 45]. В эпизоде семь топонимов, объединенных общностью денотата «древнее государство» и служащих косвенным средством раскрытия характера героини повести – Марьяны.

**Заключение.** Таким образом, топонимы, выявленные у всех авторов, участвуют в характеристике героев, изображении их внутреннего мира, обрисовке событий произведения, а также очерчивают контуры художественного пространства, выполняют яркую стилистическую функцию, поскольку часто привносят в текст эмоционально-экспрессивные коннотации.

Список литературы


1. Фонякова, О.И. Имя собственное в художественном тексте : учеб. пособие / О.И. Фонякова. – Ленинград : Изд-во ЛГУ, 1990. – 103 с.
2. Казакевич, В.С. Охота на майских жуков / В.С. Казакевич. – Москва : Изд-во Н. Филимонова, 2009. – 192 с.
3. Попова, Е. Г. Восхождение Зенты : романы / Е.Г. Попова. – Минск : Маст. літ., 2007. – 335 с.
4. Скобелев, Э.М. Пересечение параллельных / Э.М. Скобелев. – Минск: Маст. літ., 2005. – 509 с.
5. Скобелев, Э.М. Рассказы разных лет / Э.М. Скобелев. – Минск : Маст. літ., 2004. – 342 с.


## ГІСТОРЫКА-ГЕРАІЧНАЯ ПОСТАЦЬ У ДРАМАТЫЧНЫМ ВЕРШАВАНЫМ ЭПАСЕ М. ТАНКА “МІКАЛАЙ ДВОРНІКАЎ”


*Г.П. Харошка*
*Віцебск, УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”*


Да гістарычнай тэмы ў свой час звярталіся многія паэты былога Савецкага Саюза, у прыватнасці, С. Васільеў, Ф. Сухаў, С. Нараўчатаў, І. Драч, Ю. Марцінкявічус, Д. Кугульцінаў, М. Карым, А. Куляшоў, М. Арочка і інш., якія напісалі творы ў жанры драматычнай паэмы. Адпаведныя намаганні ў гэтым кірунку зрабіў і



Репозиторий ВГУ

М.Танк, стварыўшы гісторыка-гераічную драматычную паэму “Мікалай Дворнікаў”. Твор прысвечаны рэальнай гістарычнай постаці, гераічнай асобе-ураджэнцу Гомеля, сакратару ЦК камсамола Заходняй Беларусі, а потым – камісару польскага батальёна і камандзіру ўкраінскай роты імя Т. Шаўчэнкі Мікалаю Дворнікаву, які загінуў у Каталоніі ў гарах Эстрамадуры, змагаючыся з фашызмам.

Драматычная паэма “Мікалай Дворнікаў” пабудавана па прынцыпе біяграфічных твораў эпіка-апавядальнага характару з адзнакамі аўтабіяграфізму.

**Матэрыял і метады.** У даследаванні выкарыстаны прыёмы канкрэтна-гістарычнага і апісальнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На вобразе Мікалая Дворнікава аўтар паэмы імкнуўся аб’ектыўна ўвасобіць адзін з важных духоўных канфліктаў эпохі. Дворнікаў быў рана прызваны і мабілізаваны ў шарэнгі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Герою суджана было стаць не толькі адным з дзейных кіраўнікоў заходнебеларускага падполля. Жыццё кідала яго на самыя розныя і складаныя напрамкі грамадскай і рэвалюцыйнай дзейнасці. Пра ўсё гэта распавядаецца ў драматычнай паэме “Мікалай Дворнікаў”. Кожны радок мастацкага твора прасякнуты асабістымі пачуццямі і жарсцямі.

Да вядомых фактаў біяграфіі Дворнікава паэт дадае новыя дэталі, і вобраз героя яшчэ больш узмацняецца эстэтычна. Гістарычныя падзеі пераўвасабляюцца ў такую форму, якая дае творцу адпаведную свабоду ў вырашэнні аўтарскай задачы з пазіцыі праўдзівага, гісторыка-канкрэтнага адлюстравання рэчаіснасці. Дакументальны матэрыял не шкодзіць творчай фантазіі паэта, таму што кожны радок, кожнае слова, факт ён прапускае праз сэрца. У паэме адлюстравалася глыбокая памяць пра сябра-змагара, які заўчасна загінуў за свабоду. Зразумела, што гэта не проста біяграфія героя. Паэт “пераўвасобіў” біяграфічны матэрыял у мастацкі.

У кожнай частцы паэмы як бы сканцэнтраваны яркія старонкі жыцця Дворнікава. Пранікнуць у свет вобраза дапамагаюць сакрэтныя лісты, даносы, рапарты, якія дасылалі ва ўсе інстанцыі дэфэнзівы. З рапартаў паліцэйскіх становіцца зразумелым, што нейкі чалавек па мянушцы “Роберт” за кароткі тэрмін арганізаваў шмат падпольных груп: “А ў маёнтку Завоссе народ, падбухтораны ім, расправіўся з панам сваім” [1, 139]. Пад кіраўніцтвам “Роберта” і пры яго непасрэдным удзеле на так званых “крэсах усходніх” адбывалася не адна акцыя. Яго можна было ўбачыць і на Навагрудчыне, і ў Кобрынскім павеце (“Навасёлкі ўзбунтаваў на штурм чырвоны Кобрыншчыну ўзняў”) [1, 140], бываў ён і сярод нарачанскіх рыбакоў. Паліцэйскія рапарты, даносы, спробы ўлад “сцяць галаву ў падполлі” [1, 141] сведчаць пра напружаны час і драматызм падпольнай барацьбы. Герою-падпольшчыку даводзіцца дзейнічаць у складаных умовах. І толькі прафесійны вопыт канспіратара выратоўвае героя. А калі навісла прамая пагроза арышту, ён па парадзе сяброў адпраўляецца ў Варшаву, а адтуль – у Іспанію: “Здаецца мне, ёсць лепшы выхад, я не магу сядзець тут ціха… Я ірваўся ў смяротны бой за перэнейскай градой” [1, 145]. Такое жаданне было ў героя – змагацца ў адкрытых баях з фашызмам. Перад намі раскрываецца значная асоба, якая ўступае ў непрымірымы канфлікт з варожымі ёй сацыяльнымі, супрацьлеглымі сіламі. Гэта, па сутнасці, не ўмоўная нейкая “драматычная віна”, а глыбокі і зусім канкрэтны, рэальны жыццёвы канфлікт, які “закранае не толькі грамадства, але і самую сутнасць чалавека” [2, 260]. Гэты канфлікт уводзіць дзеючыя асобы паэмы ў барацьбу за сацыяльныя і нацыянальныя правы. Такая пазіцыя героя абвастрае ўнутраны драматызм, фарміруе пачуццё адказнасці за падзеі, якія адбываюцца, прымушае яго перажываць, хвалявацца, адстойваць свае перакананні, свае погляды на стан грамадства, на маральныя яго прынцыпы. У

Рэпазіторый ВДУ

такіх умовах жыцця і барацьбы фарміраваўся драматычны характар героя, які аддае сябе змаганню за светлыя ідэалы.

Каб паказаць духоўны рост, свядомасць героя, М.Танк умоўна падзяляе твор на дзве часткі, так бы мовіць, вылучае дзве арэны барацьбы – заходнебеларускую і іспанскую. Другая частка паэмы больш прадуманая, зладжаная і, на наш погляд, адпавядае патрабаванням драматычнага паэмнага жанру з улікам паўнаты псіхалагічных момантаў і перажыванняў герояў.

Драматызаваныя эпізоды з жыцця Мікалая Дворнікава асэнсоўваюцца паэтам як сведчанне трагічнага лёсу вядомага змагара за дэмакратычныя свабоды, сведчанне яго актыўнай грамадска-гістарычнай дзейнасці, самаадданай барацьбы за правы іспанскага народа. З эстэтычнага пункту гледжання элементы драматычнай структуры падпарадкоўваюцца тут законам жанру, яны дапамагаюць выказаць галоўнае – перадаць трагічнае сутыкненне XX стагоддзя ў найбольш абагульненай форме, галоўным структураўтваральным стрыжнем якой з'яўляецца асабістая пазіцыя мастака.

М. Танк імкнецца паказаць маральнае аблічча галоўнага героя, творча пераасэнсоўваючы яго ролю і месца ва ўмовах вострай барацьбы, жыццё і смерць, гераічную сутнасць яго справы. Па драматычным напаўненні, па трагічным напале найбольш значнымі, безумоўна, з'яўляюцца тыя часткі паэмы ("Бой пад Альбестам", "Лінія агню", "Адкрыты бой", "No pasaran"), у якіх увасоблены бой у гарах Эстрамадуры. У іх – вяршыннае раскрыццё героікі і трагізму, калі дзейнага, валявога, вытрыманага і знаходлівага стратэга Дворнікава мы бачым "на лініі агню". Напал змагання быў такі, што "здавалася сышліся ў рукапашнай не людзі, а Эстрамадуры горы, ахопленыя полымем і дымам" [1, 170]. У апошнім баі герой быў пасечаны шаблямі мараканскай кавалерыі. Мікалай Дворнікаў гіне гераічнай смерцю ў шарэнгах барацьбітоў-антыфашыстаў у Рэспубліканскай Іспаніі. Ён гіне за ўсеагульную справу вызвалення і выратавання народа ад фашысцкай навалы. Тут з асаблівай сілай праяўляецца ўласцівы драматычнай паэме ўзвышаны, высакапафасны стыль, што сваімі многімі рысамі ўзыходзіць да рамантычных прынцыпаў мастацкага ўвасаблення барацьбы чалавека, які вырашыў прысвяціць сябе народнай справе, усведамляючы ўласную асуджанасць.

Драматычная паэма М.Танка – высокая, засведчаная сродкамі эпасу вернасць аднаму з блізкіх таварышаў, вернасць ідэалам інтэрнацыянальнага фронту антыфашысцкай барацьбы. А гэта барацьба патрабавала максімальнага напружання духоўных і фізічных сіл народа. Усе, хто змагаўся некалі з фашызмам у іншай краіне, змагаўся таксама і за сваю ідэю, якая супрацьпастаўлялася ідэі і светаўспрыманню фашысцкай Германіі.

**Заключэнне.** Такім чынам, у сваім драматычным вершаваным эпасе Максім Танк імкнуўся не толькі сцвердзіць сябе ў якасці драматычнага паэта, але ўзнавіць свет барацьбы ў самых складаных, напружаных момантах гісторыі мінулага стагоддзя. Паэт прасачыў сувязь часоў на матэрыяле адной асобы, засяроджваючы ўвагу на знешнім і ўнутраным свеце чалавека, змяшчаючы яго ў насычаны вялікімі падзеямі час.

Спіс літаратуры

1. Танк, М. Збор твораў: у 6 т. / М.Танк. – Мінск: Маст.літ. – Т.5. – 1980. – 480 с.
2. Бугаёў, Дз. Паэзія Максіма Танка / Дз.Бугаёў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск: Бел.навука, 2003. – 310 с.

Рэпазіторый ВДУ